Таким образом, можно отметить, что развитие кадрового потенциала основано на системе непрерывного образования, подготовке и переподготовке кадров, их карьере (как наиболее важном моменте), совершенствовании организационных структур и стиля управления.

Для кадрового потенциала большое значение имеет профессиональное образование персонала. Руководство организации постоянно следит за профессиональным развитием своего коллектива, так как на результатах деятельности организации отрицательно сказывается несоответствие квалификации сотрудников. Повышая квалификацию и приобретая новые знания, умения и навыки, работник становится конкурентоспособным на рынке труда и получает дополнительные возможности для профессионального роста. Несмотря на то, что профессиональное обучение требует инвестиции значительных средств, такие затраты являются капиталовложением в повышение производительности труда. Профессиональное образование может способствовать общему интеллектуальному развитию, расширяет эрудицию и круг общения, укрепляет уверенность в себе.

УДК [93/94+908]:(083.94)+378.147

***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

## ПАДРЫХТОЎКА КРАЯЗНАЎЧЫХ ПРАЕКТАЎ ПАДЧАС ВЫВУЧЭННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

**Анатацыя.** У артыкуле прадстаўлены дзесяцігадовы педагагічны вопыт арганізацыі падрыхтоўкі краязнаўчых праектаў па гісторыі Беларусі беларускімі і замежнымі студэнтамі 1-га і 2-га курсаў БДУКМ. Аўтар паказвае, як праектная краязнаўчая дзейнасць студэнтаў суадносіцца з мэтай і задачамі, вызначанымі ў вучэбных праграмах па дысцыплінах абавязковага модуля «Гісторыя» і садзейнічае фарміраванню адпаведных акадэмічных кампетэнцый выпускнікоў універсітэта. Выкладчыцкі вопыт аўтара сведчыць, што выкарыстанне тэхналогіі стварэння країназнаўчых праектаў гістарычнай накіраванасці кітайскімі

студэнтамі садзейнічае іх знаёмству з асноўнымі этапамі гістарычнага развіцця беларускіх зямель, фарміраванню станоўчага іміджу Беларусі і павышэнню цікавасці да вывучэння гісторыі краіны, у якой яны атрымліваюць вышэйшую адукацыю.

**Ключавыя словы:** гісторыя, дысцыпліны абавязковага модуля, вучэбныя і пазнавальныя задачы, акадэмічныя кампетэнцыі, краязнаўчыя праекты, педагагічны вопыт, айчынныя і замежныя студэнты 1–2-га курсаў.

***E. Pavlova,***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

## PREPARATION OF LOCAL HISTORY PROJECTS AS PART OF THE STUDY OF HISTORY

**Abstract.** Article presents author's shares ten-year pedagogical experience of organizing projects on the history of Belarus by Belarusian and foreign students of the 1st and 2nd years. The author reveals how project-based local history activities of students correlate with the aim and objectives defined by the curricula for the disciplines of the compulsory module «History» and contribute to the formation of relevant academic competences of university graduates. The use of the project technology for creating projects on Belarusian history by Chinese students studying at BSUCA contributes to their familiarization with the main stages of historical development of the Belarusian lands, the formation of a positive image of the country and increasing their interest in studying the history of the country where they receive higher education.

**Keywords:** history, local history projects, learning aims and objectives, academic competences, Belarusian and international students, teaching experience.

Асноўнымі мэтамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі з'яўляюцца фарміраванне і развіццё кампетэнцый і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асобасных задач і функцый. Месца вучэбных дысцыплін абавязковага модуля «Гісторыя» ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам вывучэння гісторыі Беларусі з'яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканаміч-

нага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі.

Згодна тыпавой праграме абавязковага модуля «Гісторыя» адной з задач вывучэння гэтага блока дысцыплін з'яўляецца набыццё студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных падзей і фактаў. Дадатковай задачай можна пазначыць рэалізацыю адукацыйна-выхаваўчай работы ў працэсе іх вывучэння. Як паказала практыка выкладання гістарычных дысцыплін на ўсіх факультэтах БДУКМ, у студэнтаў розных спецыяльнасцей існуе вялікая прага да ведання сваёй гісторыі. Жыццё сучаснай моладзі ў час інфармацыйных тэхналогій істотна адрозніваецца ад жыцця студэнтаў папярэдніх пакаленняў. Інфармацыйныя тэхналогіі часам выцясняюць жывыя адносіны ў сям'і, чым пэўным чынам перашкаджаюць перадачы вопыту паміж пакаленнямі. Краязнаўчыя праекты студэнтаў скіраваны на тое, каб запаволіць гэты працэсс, выклікаць цікавасць да дзейнасці такога напрамку, развіць пачуццё грамадскасці і патрыятызму.

Краязнаўчы праект можна разглядаць як адно з вучэбных заданняў, падчас якога пазнавальная задача вырашаецца не па гатовых узорах, а вымагае новых, дзеля іх патрэбны здагадка, папярэдні разлік, арыентацыя на перспектывы пазнання і паглыбленне, удасканаленне наяўных ведаў і ўменняў.

У якасці мэты падрыхтоўкі краязнаўчых работ можна вызначыць садзейнічанне абуджэнню цікавасці студэнтаў да навукова-даследчай працы ў гэтым кірунку.

Пачатак стварэнню краязнаўчых праектаў паклала ў 2011 г. прапанова студэнтаў 1-га курса факультэта музычнага мастацтва (далей – ФММ) падрыхтаваць падчас вывучэння дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» ў якасці дадатковай практычнай дзейнасці творчыя работы па гісторыі малой радзімы і радаводу сваёй сям'і. Так, у другім семестры 2010/11 навуч. г. было створана каля 10 гісторый краю і больш за 20 радаводаў. Студэнцкія праекты-альбомы паказалі, што ганарыцца малой радзімай могуць і ўраджэнцы невялікіх населеных пунктаў. Сярод лепшых работ таго перыяду можна вызначыць «Летапіс вёскі Сталовічы» (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці), выкананы Дар'яй Давідоўскай. Пачынаючы з 2011/12 навуч. г. такая форма работы студэнтаў ажыццяўляецца пастаянна.

Студэнты штогод прадстаўляюць не менш за 20 праектаў. Абвяшчэнне ў Рэспубліцы Беларусь 2018–2020 гг. Гадамі малой радзімы садзейнічала павышэнню цікавасці студэнтаў да роднага краю.

Праекты ажыццяўляюцца на 1–2-х курсах у двух напрамках: гісторыка-краязнаўчы для студэнтаў усіх факультэтаў БДУКМ; краіназнаўчы для студэнтаў з КНР.

Прапанова падрыхтаваць праект такога кшталту агучваецца выкладчыкам падчас першай лекцыі. На працягу першага месяца семестра студэнты падбіраюць матэрыял, вызначаюць асноўныя напрамкі работы. У працэсе падрыхтоўкі праекта знаёмяцца з дакументальна-краязнаўчай хронікай «Памяць» па раёнах Беларусі, праводзяць апытанне сваякоў і аднавяскоўцаў, вывучаюць матэрыялы перыядычнага друку, электронныя рэсурсы. Выкладчык кансультуе іх па ўсіх пытаннях. Наяўнасць краязнаўчага праекта ўлічваецца выкладчыкам пры атэстацыі.

У краязнаўчую работу па жаданні студэнтаў можна дадаць частку пра падзеі 1939–1945 гг. Так, у мінулым і бягучым навучальным годзе гэтыя раздзелы студэнцкіх праектаў па гісторыі называліся: «Гісторыя вайны ў гісторыі маёй сям’і», «Суайчыннікі – героі Вялікай Айчыннай», «Дзеці ваеннай пары», «Памяць пра вайну». Практыка ўключэння ў работы матэрыялу пра падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны вынікае са значнасці гэтага перыяду для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў сучасным беларускім грамадстве.

Краязнаўчыя праекты выконваюцца на абедзвюх дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь. Гатовыя работы прадстаўляюцца за некалькі тыдняў да кантролю ведаў па дысцыпліне «Гісторыя» ці «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны». Творчы падыход да прадстаўлення работы вітаецца выкладчыкам. Першыя праекты ўяўлялі сабой краязнаўчыя альбомы з напісанымі ад рукі тэкстамі. Зараз студэнты выбіраюць такую форму прадстаўлення свайго даследавання, як друкаваная ці электронная прэзентацыя. Складаная эпідэміялагічная сітуацыя ў 2020–2021 гг. пасадзейнічала пераходу да стварэння электронных версій. Лепшыя работы прадстаўляюцца аднакурснікам на семінарскіх і практычных занятках ці размяшчаюцца на Padlet.

У перыяд з 2015 г. па 2019 г. найбольш цікавыя праекты былі падрыхтаваны студэнтамі ФММ і факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці (далей – ФКіСКД). Гэтыя работы расказвалі не толькі пра вядомыя абласныя і раённыя цэнтры – Баранавічы, Брэст, Крычаў, але і пра невялікія населеныя пункты – Рудабелку, аг. Прылукі, в. Ясень у Асіповіцкім раёне. У 2017 г. студэнт ФКіСКД Дзяніс Ільінчук зняў аматарскі фільм пра г. п. Смілавічы, дзе расказваецца пра помнікі гісторыі і культуры, музейныя ўстановы і вядомых ураджэнцаў гэтага месца. За 2019–2020 гг. студэнтамі ФММ былі падрыхтаваны работы пра г. Магілёў, Глыбокае, Тураў, п. Чонкі ў Гомельскай вобласці. На працягу 2020/21 н. г. на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва студэнты кафедры харэаграфіі Паліна Драздова і Яўгенія Петухова далучыліся да праекта з цікавымі працамі аб г. Гомелі і Барысаве. У 2021 г. студэнтка ФКіСКД Дар’я Рабека паспрабавала прадставіць гісторыю сталічнага мікрараёна Сухарава. Лепшыя з праектаў апошніх гадоў у красавіку 2021 г. дэманстраваліся на стэндзе БДУКМ у час правядзення XIX Рэспубліканскай выстаўкі навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі. Сярод ваенна-гістарычных краязнаўчых работ можна вызначыць праекты пра Дняпроўскую флатылію і мост праз р. Бярэзіну ў г. Барысаве ад студэнтаў музычных спецыяльнасцей, а таксама – пра аг. Дукору, Астрашыцкі Гарадок, Ашмянскі раён, г. Полацк, Бабруйск, Рэчыцу і Слуцк – ад студэнтаў ФКіСКД.

Замежнікі вывучаюць дысцыпліну «Гісторыя Беларусі» ў тым жа аб’ёме і аднолькавых умовах, што і беларусы: па выніку прадугледжаны дыферэнцыраваны залік. Але студэнты, якія прыехалі з краін Азіі, маюць абсалютна іншы менталітэт і ў лепшым выпадку ўрыўкавыя веды па еўрапейскай гісторыі. Выкладанне «Гісторыі Беларусі» кітайскім студэнтам у нечым нагадвае выкладанне «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» у 4-м класе сярэдняй школы.

Важныя задачы падчас выкладання дысцыпліны замежным студэнтам – пазнаёміць іх з асноўнымі этапамі гістарычнага развіцця Беларусі і стварыць станоўчы вобраз краіны. З гэтай нагоды, каб зацікавіць кітайскіх студэнтаў, у 2021 г. аўтар

вырашыла перайсці да выкарыстання інтэрактыўных тэхналогій і ў якасці вучэбнага задання прапанавала ім стварыць краіназнаўчыя праекты гістарычнай накіраванасці. Тэмамі былі абраны развіццё культуры Беларусі (архітэктура, выяўленчае мастацтва, музыка, тэатр) у розныя гістарычныя перыяды, выбітныя асветнікі, прадстаўнікі найбольш вядомых магнацкіх родаў Беларусі, хлопцы пры жаданні маглі падрыхтаваць праекты пра знакавыя бітвы падчас узброенных канфліктаў. Адпаведна калектывісцкаму характару кітайскага менталітэту, студэнты падзяліліся на некалькі груп па 4–6 чалавек і на працягу 1,5 месяцаў рыхтавалі свае прэзентацыі. Ідэя заключалася ў стварэнні прэзентацыі на 7–15 слайдаў. Арыгінальны творчы падыход не з'яўляецца адметнай асаблівасцю кітайцаў, таму падчас абмеркавання гэтага вучэбнага задання аўтар паказала ім у якасці прыкладаў некалькі прэзентацый беларускіх студэнтаў. Для спрашчэння пошуку інфармацыі студэнтам прапанавалі азнаёміцца з матэрыялам на шэрагу электронных рэсурсаў: http://www.belarus.by, https://planetabelarus.by і https://vedaj.by/index.php/ru/dostoprim. Як і беларускія студэнты, кітайцы пры неабходнасці кансультаваліся па пытаннях, узнікаючых пры рабоце над прэзентацыяй.

Падсумоўваючы, можна канстатаваць, што падчас выканання студэнтамі краязнаўчых праектаў вырашаюцца адразу некалькі вучэбных задач: абагульніць і пашырыць веды студэнтаў пра сваю мясцовасць; вывучыць падзеі Другой сусветнай вайны на тэрыторыі свайго раёна; навучыць студэнтаў афармляць навуковую работу, спрыяць фарміраванню навыкаў самастойнай працы. Стварэнне краязнаўчых праектаў садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў шэрагу важных акадэмічных кампетэнцый: валодаць і ўжываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач (АК-1), валодаць даследчымі навыкамі (АК-3), умець працаваць самастойна (АК-4), быць здольным інтэграваць новыя ідэі (крэатыўнасць) (АК-5). Вывучэнне малой радзімы студэнтамі станоўча ўплывае на павышэнне якасці іх гістарычнай адукацыі, садзейнічае грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню, усебаковаму развіццю здольнасцей, фарміраванню практычных навыкаў.